***Н. І. Наркевіч,*** *канд. мастацтвазнаўства,*
*ст. выкладчык каф. беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

# ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД ДАСЛЕДАВАННЯЎ ЮВЕЛІРНАГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XII–XVIII стст.

Літаратурныя крыніцы па гісторыі ювелірнага мастацтва Беларусі адносна нешматлікія. У асноўным гэта даследаванні ў выглядзе разрозненых артыкулаў, у якіх разглядаліся толькі асобныя вузкія пытанні па згаданай тэматыцы.

Своеасаблівасць такіх публікацый – у іх разнапланавасці. Да таго ж, вывучэннем гісторыі ювелірнай справы займаліся розныя спецыялісты: мастацтвазнаўцы, археолагі, гісторыкі, этнографы, і таму публікацыі носяць адпаведна мастацтвазнаўчы, археалагічны, этнаграфічны характар.

Апублікаваныя матэрыялы, на падставе якіх можна зрабіць выснову пра асаблівасці развіцця беларускага ювелірнага мастацтва, падзяляюцца на наступныя групы: публікацыі беларускіх вучоных; даследаванні аўтараў Расіі і Украіны; публікацыі аўтараў замежжа, у якіх адлюстроўваюцца новыя тэарэтычныя распрацоўкі вывучэння ювелірнай справы.

Асаблівую ўвагу пры вывучэнні прадстаўленай тэмы неабходна надаць айчынным і расійскім публікацыям.

Сведчанняў пра ювелірнае мастацтва Беларусі XII–XVIII стст. айчынная мастацтвазнаўчая і гістарычная навука налічвае няшмат, тым не менш, прысвечаныя агульным ці прыватным пытанням рамесніцкай вытворчасці, яны дазволілі скласці пэўную карціну мінулага беларускай культуры.

Не абмінуў тэму ювелірнага рамяства яшчэ ў пачатку XX ст. адзін з першых даследчыкаў гісторыі беларускага мастацтва М. Шчакаціхін. У сваёй працы «Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва» ён разгледзеў дэталі ўбрання, зрабіў параўнальны аналіз іх паходжання і мастацкіх вартасцей, апісаў, сістэматызаваў і падаў у схемах ювелірныя ўпрыгажэнні [18].

Пасля паўвекавога перапынку да гэтай праблематыкі звярнуліся даследчыкі айчыннага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У гэтых адносінах навуковую каштоўнасць мае праца Н. Высоцкай «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII–XVIII стагоддзяў», дзе паказваюцца кампаненты ювелірнага ўбрання, прадметы рэлігійнага культу, якія захоўваюцца ў музеях Беларусі

[7]. Падаючы помнікі ювелірнага мастацтва і мастацкага металу, аўтар дакладна характарызуе мастацкія вартасці вырабаў, выяўляе іх тыповыя рысы, самабытнасць, узаемасувязі і ўзаемаўплывы, вызначае асноўныя асаблівасці мастацкай школы. На аснове пададзенага матэрыялу робяцца высновы пра віртуознае валоданне майстрамі шматлікімі тэхнічнымі прыёмамі апрацоўкі металу. Даследчыца падкрэслівае, што станаўленне і развіццё культуры на Беларусі адбывалася ў працэсе пераасэнсавання традыцый мастацтва Візантыі, Кіеўскай Русі, Заходняй Еўропы, краін Міжземнамор'я і Усходу.

Вынікам шматгадовай даследчыцкай дзейнасці ў галіне беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва стала праца Я. Сахуты «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», змешчаная ў шматтомным выданні «Беларусы» [3]. У аснову кнігі пакладзены тэматычны прынцып, які адпавядае канцэпцыі пабудовы навуковага выдання. Матэрыял падаецца па раздзелах у адпаведнасці з асноўнымі відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў храналагічным парадку – ад старажытнасці да нашых дзён. У раздзеле, прысвечаным мастацкай апрацоўцы металаў, даюцца шматлікія і грунтоўныя звесткі пра асаблівасці развіцця ювелірнай справы ў Беларусі.

Ювелірнае мастацтва Беларусі часцей за ўсё згадваецца ў кантэксце даследаванняў, прысвечаных гісторыі касцюма. Такая сітуацыя сведчыць пра неабходнасць вывучэння ювелірных вырабаў праз адзінства з ансамблем касцюма і адпаведна з культурай у цэлым.

У мастацтвазнаўчым даследаванні «Тэкстыль Сярэднявечча на землях Беларусі» Г. Барвенава на падставе археалагічных, пісьмовых і мастацкіх крыніц падае звесткі пра віды тканін, арнаментыку, каларыстыку і іх сімволіку, спосабы вырабу і аздаблення тэкстылю. Аўтар звяртае ўвагу на змены ў аздобе тэкстылю, характар і якасць якой залежалі ад месца гаспадара ў грамадстве. Залатыя, сярэбраныя, пазалочаныя, пасярэбраныя, аздобленыя фініфцю нашыўкі, пацеркі, гузікі, каштоўныя камяні, перлы былі ўласцівы Сярэднявеччу, але мянялася іх колькасць, арнаментыка, насычанасць у касцюме [1].

У выданнях В. Бялявінай і Л. Ракавай «Мужчынскі касцюм на Беларусі» і «Жаночы касцюм на Беларусі» на аснове разнастайных гістарычных крыніц XV–XVIII стст., этнаграфічнай і этналінгвістычнай літаратуры XIX–XX стст. комплексна разгледжаны працэс развіцця мужчынскага і жаночага касцюмаў розных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльных слаёў насельніцтва Беларусі з глыбокага мінулага да сучаснасці [4; 5]. Асобныя раздзелы гэтых выданняў прысвечаны аксесуарам да касцюма, у тым ліку і ўпрыгажэнням.

Вывучэнне асаблівасцей развіцця айчыннага ювелірнага мастацтва грунтоўна дапаўняе праца К. Лавыш «Художественные традиции восточной и византийской культуры в искусстве древних городов Беларуси (X–XIV вв.)» [10]. Успрыняцце мастацкіх традыцый усходняй і візантыйскай культуры разгледжана аўтарам у кантэксце агульнаеўрапейскага працэсу. Даследчыцай класіфікаваны прадметы ўсходняга і візантыйскага мастацкага імпарту, адзначана яго роля ў распаўсюджванні ўсходніх матываў у беларускім манументальным жывапісе, мастацкім рамястве і рукапісных помніках. У асобным раздзеле «Художественное ремесло (ювелирные изделия и мелкая пластика)» аўтар звяртае ўвагу на ўсходняе і візантыйскае паходжанне некаторых тыпаў ювелірных упрыгажэнняў, на шэраг усходніх матываў у іх дэкоры, якія, у сваю чаргу, падзяляюцца на раслінныя і зааморфныя.

Значную каштоўнасць уяўляюць працы Э. Максімавай, якія сталі істотнай крыніцай у вывучэнні прадметаў рэлігійнага культу XVI–XVII стст. [12]. Артыкулы даследчыцы ўтрымліваюць каштоўную мастацтвазнаўчую інфармацыю пра самабытны характар шатаў беларускіх абразоў, іх мастацкія якасці. Аўтар паказвае тыя змены, што адбыліся ў гэты час у дэкоры беларускіх шатаў, іх вобразна-выяўленчым ладзе.

Важкі ўклад у асвятленне ранніх старонак рамесніцкай вытворчасці ўнеслі таксама гісторыкі і археолагі Беларусі, працы якіх каштоўныя перш за ўсё багатым рэчавым матэрыялам – плённым пажыткам і для мастацтвазнаўцаў.

Першай працай па гісторыі ўбрання X–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі можна лічыць кнігу Л. Дучыц «Касцюм жыхароў Беларусі X–XIII стст. (паводле археалагічных звестак)» [6]. Даследчыца раскрывае асаблівасці адзення і ўпрыгажэнняў да яго. У кнізе разглядаюцца вытокі беларускага ўбрання, на падставе археалагічных звестак характарызуюцца асноўныя віды адзення жыхароў Беларусі, упрыгажэнні і іншыя дэталі ўбрання. Асобныя главы даследавання прысвечаны касцюму знаці і гараджан. На аснове апрацаванага матэрыялу аўтар робіць выснову, што адзенне знаці і гараджан было падобна да ўбрання тых жа саслоўяў ва ўсёй Усходняй Еўропе, але для яго было характэрна шмат мясцовых традыцыйных балта-славянскіх элементаў. Сялянскае адзенне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падаецца як этнічны ідэнтыфікатар, паказваюцца яго рэгіянальныя асаблівасці, адметныя ўпрыгажэнні.

У вывучэнні вырабаў хрысціянскага культу вялікае значэнне маюць працы А. Башкова. У дысертацыйным даследаванні «Предметы христианского культа индивидуального использования конца X–XIV вв. на территории Беларуси: классификация, топография, хронология» ўпершыню быў праведзены аналіз і класіфікацыя помнікаў рэлігійнага культу індывідуальнага выкарыстання, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі [2]. Вывучаны і прааналізаваны з улікам сацыяльных і культурных працэсаў пытанні мясцовай вытворчасці прадметаў хрысціянскага культу.

Асвятленне больш шырокай тэмы – гісторыі старажытнарускага ювелірнага ўбрання – пачалося толькі з канца XIX ст. у расійскай гістарыяграфіі. Большасць даследаванняў адлюстроўвала трывалую сувязь ювелірных вырабаў вышэйшых слаёў насельніцтва з візантыйскімі традыцыямі; на ўплывы металаапрацоўкі суседніх этнапалітычных утварэнняў увага не звярталася. Тым не менш даследчыкі шмат зрабілі ў справе перыядызацыі, класіфікацыі і інвентарызацыі ювелірных вырабаў і іх кампанентаў.

Першыя працы, якія адносяцца да канца XIX – пачатку XX ст., можна ўмоўна назваць каталагізатарскімі, апісальнымі, параўнальна-абагульняючымі і інтуітыўнымі.

Значны ўклад у вывучэнне гісторыі ювелірнага мастацтва часоў Кіеўскай Русі зрабіў Н. Кандакоў. Ён з’яўляецца прадстаўніком каталагізатарскага напрамку вывучэння ювелірнага рамяства, яго працы шмат гадоў з’яўляліся своеасаблівай энцыклапедыяй па гісторыі ювелірнай справы [8]. Даючы ацэнку развіццю старажытнарускага мастацтва, Н. Кандакоў перабольшваў ролю візантыйскага ўплыву. Асобныя састаўныя часткі выробленага мясцовымі майстрамі княжацкага ювелірнага ўбрання, якое фарміравалася пад уплывам мясцовых традыцый, ён нярэдка вызначаў як грэка-ўсходнія альбо руска-візантыйскія. Н. Кандакоў падрабязна прыпыняўся на пытанні ўзаемасувязі, пераемнасці старажытнарускай і візантыйскай ювелірнай справы. Яго даследаванні вельмі каштоўныя як першыя спробы разгледзець старажытнарускую ювелірную справу ў агульным кантэксце развіцця сусветнай культуры. Для прадстаўнікоў гэтага напрамку характэрна высокая цікавасць да грунтоўных гісторыка-мастацтвазнаўчых праблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У канцы XIX ст. з’яўляюцца і першыя даследаванні тыпалагізатарскага напрамку. Працы па сістэматызацыі назапашаных на той час сведчанняў пра старажытнарускую ювелірную справу былі прадстаўлены А. Спіцыным. Ён не толькі склаў зводкі пахавальнага інвентара, але і вызначыў шэраг тыпаў скроневых колцаў, якія адрозніваліся па тэрыторыях распаўсюджвання і былі характэрныя для летапісных плямён [16]. Даследчыкам была ўпершыню прапанавана і схема апісання ювелірнага ўбрання, дзе яго часткі (галаўное, шыйнае, упрыгажэнні рук) разглядаліся комплексна.

Значная роля ў вывучэнні старажытнарускага рамяства належыць Б. Рыбакову. У 1948 г. выходзіць у свет яго фундаментальная праца «Ремесло Древней Руси». Яна адкрыла новы этап у вывучэнні старажытнарускага рамяства, у тым ліку і ювелірнай справы. У главах, прысвечаных развіццю ювелірнага мастацтва, аўтар падрабязна спыняецца на тэхніцы выканання ўпрыгажэнняў. У працы вызначана некалькі ювелірных майстэрняў на тэрыторыі старажытнага Кіева, а таксама шэраг асаблівасцей ювелірных школ іншых гарадоў [13]. Даследаванне стала падставай для развіцця тэхналагічнага напрамку ў гісторыі вывучэння старажытнарускай ювелірнай справы. Пасля выдання кнігі Б. Рыбакова адышло ў мінулае ўяўленне пра старажытнарускую ювелірную справу як прымітыўнае адлюстраванне візантыйскага рамяства.

Да тэмы старажытнага ювелірнага мастацтва звяртаецца Г. Карзухіна ў манаграфіі «Русские клады IX–XIII вв.» [9]. Метад датавання, выкарыстаны Б. Рыбаковым, названы Г. Карзухінай «інтуітыўным» (не заснаваным на тыпалогіі). Тым не менш даследчыца была адным з яркіх прадстаўнікоў гэтага «інтуітыўнага» напрамку. Высновы Г. Карзухінай, якая вылучыла шэраг паслядоўна змяняючых адзін аднаго старажытнарускіх ювелірных убранняў, грунтуюцца не на тыпалогіі, а на дэталёвых назіраннях за зменамі характару ўпрыгажэнняў і складу старажытнарускіх скарбаў на працягу IX–XIII стст.

Г. Карзухіна таксама вылучыла рэгіянальныя асаблівасці мужчынскага ўрачыстага ювелірнага ўбрання ў Полацкім княстве, Сярэднім Падняпроўі, Навагрудскай зямлі. Па матэрыялах скарбаў, у тым ліку Віцебскай і Полацкай зямлі, яна спрабавала аднавіць мужчынскі і жаночы комплекс металічных упрыгажэнняў. Навуковыя высновы аўтара, заснаваныя на каталагізатарскай працы, вывучэнні тэхнікі вытворчасці ўпрыгажэнняў разам з надзвычайнай навуковай інтуіцыяй, не страцілі сваёй актуальнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новым крокам у вывучэнні старажытнарускай ювелірнай справы з'явіліся тыпалагічныя працы М. Сядовай, прысвечаныя знаходкам са старажытнага Ноўгарада [15]. Даследчыцай вызначаны тыпы ювелірных упрыгажэнняў, характэрных для старажытнага Ноўгарада, прыведзена шырокае кола аналогій.

Сёння назіраецца павелічэнне колькасці прац, якія могуць быць аднесены да тэхналагічнага напрамку [11]. Аўтары выкарыстоўваюць розныя методыкі даследавання: візуальнае назіранне з выкарыстаннем бінакулярнага мікраскопа і фотаздымкі рэчаў з вялікім павелічэннем; металаграфічны аналіз; вывучэнне хімічнага складу сплаваў; эксперыментальныя працы па вырабу рэчаў у тэхніцы ліцця, скані, зярнення; вывучэнне інструментарыя ювеліраў.

Працы археолагаў 80–90-х гг. XX – пачатку XXI ст. вызначае актыўная цікавасць да выкарыстання тыпалагічнага метаду, шырокі агляд матэрыялу і імкненне не абмяжоўвацца асобнымі рэгіёнамі, пераход ад дэталёвага вывучэння асобных тыпаў ювелірных упрыгажэнняў да значных гістарычных абагульненняў. Даследчыкаў гэтага пакалення аб'ядноўвае імкненне выкарыстаць дамінанты ўсіх пералічаных метадаў у вывучэнні старажытнарускай ювелірнай справы.

Сярод сучасных расійскіх даследчыкаў варта вылучыць С. Рабцаву, працы якой прысвечаны фарміраванню жаночага ювелірнага ўбрання Старажытнай Русі [14]. У той жа час ёю разглядаецца шэраг ювелірных вырабаў, якія маглі выкарыстоўвацца і ў мужчынскім убранні (дыядэмы, буйныя грыўні або ланцугі са змяінымі ці драконавымі галовамі на канцах).

Паралельна развіваецца і своеасаблівы мастацтвазнаўча-апісальны напрамак. Гэтаму напрамку не ўласцівы тыпалагічныя пабудовы, асноўная ўвага ўдзяляецца вызначэнню стылістычных асобных груп ювелірных вырабаў і ювелірных школ. Асобна адзначым працу І. Сцерлігавай «Драгоценный убор древнерусских икон XI–XIV веков» – першае манаграфічнае даследаванне аздобы старажытнарускіх абразоў [17]. Абапіраючыся на аналіз уцалелых помнікаў, дадзеныя рэстаўрацыі, пісьмовыя і выяўленчыя крыніцы, аўтар даказвае існаванне змястоўнага і мастацкага адзінства абраза і яго ўбрання як цэласнага ансамбля, вызначае паходжанне каштоўнага аздаблення, яго склад, вывучае тэрміналогію яго частак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Велізарная колькасць матэрыялаў засталася па-за ўвагай вучоных, многія аспекты ювелірнага мастацтва Беларусі пакуль не даследаваны. Таму неабходна далейшая работа па пошуку гістарычных крыніц у архівах і бібліятэках Рэспублікі Беларусь і замежжа. Падводзячы вынік гістарыяграфічнаму агляду, можна адзначыць, што на сённяшні дзень ёсць неабходныя ўмовы каб асвятліць станаўленне беларускай ювелірнай справы XII–XVIII стст. на фоне шырокага кола аналогій, якое дазваляе вызначыць мастацтвазнаўчы і гістарычны кантэкст развіцця ювелірнага ўбрання і прадметаў рэлігійнага культу.


1. *Барвенава, Г. А.* Тэкстыль Сярэднявечча на землях Беларусі / Г. А. Барвенава ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2008. – 246 с.

2. *Башков, А. А.* Предметы христианского культа индивидуального использования конца X–XIV вв. на территории Беларуси: классификация, топография, хронология: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.06 / А. А. Башков ; Ин-т истории НАН Беларуси. – Минск, 2000. – 19 с.

3. *Беларусы :* у 12 т. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2009. – Т. 8 : Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Я. М. Сахута. – 2005. – 351 с.

4. *Бялявіна, В. М.* Жаночы касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 350 с.

5. *Бялявіна, В. М.* Мужчынскі касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 302 с.

6. *Дучыц, Л. У.* Касцюм жыхароў Беларусі X–XIII стст. : (паводле археалагічных звестак) / Л. У. Дучыц ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 80 с.

7. *Дэкаратыўна-прыкладное* мастацтва Беларусі XII–XVIII стагоддзяў : альбом / аўт.-склад. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1984. – 232 с.

8. *Кондаков, Н. П.* Русские клады : исследование древностей великокняжеского периода / Н. П. Кондаков. – СПб. : Тип. гл. упр. уделов, 1896. – Т. 1. – 213 с.

9. *Корзухина, Г. Ф.* Русские клады IX–XIII вв. / Г. Ф. Корзухина ; Ин-т истории матер. культуры АН СССР. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1954. – 156 с.

10. *Лавыш, К. А.* Художественные традиции восточной и византийской культуры в искусстве древних городов Беларуси (X–XIV вв.) : автореф. дис. ... канд. искусствоведения: 17.00.04 / К. А. Лавыш ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора НАН Беларуси. – Минск, 2005. – 19 с.

11. *Луговой, В. П.* Технология ювелирного производства : учеб. пособие / В. П. Луговой. – М. : НИЦ Инфра-М ; Минск : Новое знание, 2012. – 526 с.

12. *Максімава, Э. С.* Матэрыялы да гісторыі беларускага злотніцтва (арнаментальнае мастацтва злотнікаў «Віленскага кола») / Э. С. Максімава //


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Помнікі культуры : новыя адкрыцці : зб. арт. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР / рэд. С. В. Марцэлеў. – Мінск, 1985. – С. 93–101.

13. *Рыбаков, Б. А.* Ремесло Древней Руси / Б. А. Рыбаков ; отв. ред. Б. Д. Греков. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1948. – 791 с.

14. *Рябцева, С. С.* Древнерусский женский ювелирный убор IX– XIII вв. в контексте евразийских культурных связей: основные тенденции формирования : автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.06 / С. С. Рябцева ; Гос. Эрмитаж. – СПб., 2001. – 24 с.

15. *Седова, М. В.* Ювелирные изделия древнего Новгорода (X– XV вв.) / М. В. Седова. – М. : Наука, 1981. – 195 с.

16. *Спицын, А. А.* Расселение древнерусских племен по археологическим данным / А. А. Спицын // Журн. м-ва нар. просвещения. – 1899. – Ч. 324. – С. 301–340.

17. *Стерлигова, И. А.* Драгоценный убор древнерусских икон XI– XIV веков : происхождение, символика, художественный образ / И. А. Стерлигова ; Гос. ин-т искусствознания М-ва культуры РФ. – М. : Прогресс-Традиция, 2000. – 261 с.

18. *Шчакаціхін, М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 330 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ